Яркая и эксцентричная графическая работа Эрте с изображением формы ракушки, складок и кисточек воодушевляет на создание образа столь же красивого и парадного. Опираясь на эти мотивы, разработана коллекция сумок «Fan Fantasy». Поясная сумка (рис. 2 *а*) изготовлена отдельно от пояса, который в дальнейшем может быть самостоятельным аксессуаром. Так же её можно прикреплять к брюкам или джинсам с помощью карабина, а при необходимости носить через плечо. Петля в конструкции сумки позволяет носить ее на руке в виде клатча, и при этом закрывает её путем стягивания. Такая сумка прекрасно дополняет как повседневный, так и вечерний образы и делает его неповторимым.



*а* *б* *в*

Рисунок 2 – Коллекция сумок «Fan Fantasy»

Остальные модели коллекции сумок Fan Fantasy (рис. 2 *б, в*) предназначены скорее для повседневного образа. Они лаконичны и крайне практичны в носке.

Последняя модель имеет необычную форму, её ручки расположены так, чтобы сумка оставалась больше за спиной и тем самым делает её более удобной. Кисточки добавляют образу игривости, а серый цвет прекрасно оттеняет все оттенки кожи на переднем плане. Одним из материалов этой сумки является пластик (поливиниловая пленка), которая контрастирует с яркой молнией и делает форму ракушки более распознаваемой.

Необычной расцветки материал и интересный дизайн сумок привлечет внимание даже капризной модницы и станет ярким акцентом во всем образе.

Список использованных источников:


1. Чеботарь, С. Художник аре-деко Роман Петрович Тыртов-Эрте. [Электронный ресурс]. – Режим доступа : http://www.liveinternet.ru/users/vakiel/post317761345.
2. Конарева, Ю. С. Трансформационный подход к разработке современных аксессуаров / Ю. С. Конарева, О. А. Белицкая, О. А. Царицына // Дизайн и технологии. – 2015. – № 46. – С. 29–32.
3. Конарева, Ю. С. Коллекция женских аксессуаров и обуви под девизом «Симпл» / Ю. С. Конарева, Л. Р. Сницар, В. С. Строганова // Инновационное развитие легкой промышленности : материалы международной научно-практической конференций молодых ученых и специалистов. – Казань : КНИТУ. – Т. 2. – С. 156–160.



УДК 677.923.77.


## РАРЫТЭТЫ КАНЦА XVIII – ПАЧАТКУ XX СТАГОДДЗЯЎ З КАЛЕКЦЫІ ЭТНАГРАФІІ ВІЦЕБСКАГА АБЛАСНОГА КРАЯЗНАЎЧАГА МУЗЕЯ


***Салаўёва С.У., старшы навуковы супрацоўнік навукова-даследчага адзела фондаў***

*Віцебскі абласны краязнаўчы музей, г. Віцебск, Рэспубліка Беларусь.*



Рэферат. *Матэрыялы артыкула ўваходзяць ў альбом «Традыцыйнае адзенне Віцебшчыны»; яны складаюць першы раздзел выдання і ўключаюць даследаванні прадметаў мяшчанскага і сялянскага касцюмаў даваеннай калекцыі Віцебскага абласнога краязнаўчага музея.*

Ключавыя словы: мануфактурныя тканіны, узорнікі, набіўныя дошкі, двухбаковае шытво.

Касцюм мы ўспрымаем як знак часу, саслоўнай і нацыянальнай прыналежнасці. Да калекцыі музея належаць прадметы канца XVIII – пачатку XIX стагоддзяў – каруны, камізэлькі і спадніцы з комплексу святочнага мяшчанскага касцюма Віцебскай губерні. [4, 5]. У 1834 годзе губернскі сакратар В. Завялейскі так апісвае касцюм мяшчанак: «женская одежда витеблян: это смесь восточной с древней польской, а отчасти, русской. На грудь (мяшчанкі) надевают китлик, род корсета; рукава рубашки широкие. “Юпка” и фартук <...> штофные; на шее жемчуг; бедные носят красные кораллы» [11, стар. 656]. У калекцыі музея камізэлькі з парчы і шоўка свецкага крою з каўняром, двухбортнай засцежкай, валікамі для спадніцы і спрошчанага сарафаннага крою (КП 940–944, 946, 947); таксама батыставая кашуля з каўняром, доўгімі рукавамі, сабранымі ўнізе (элементам свецкага касцюму). Краўцамі ў той час былі габрэі. Пра камізэльку “кітлік” з Віцебскай губерні паведамляе этнограф Н.Я. Нікіфароўскі: «“Китлик” справлялся раз в девической жизни и донашивался в первые годы замужества» [16, стар. 118]. Гэты тэрмін габрэйскага паходжання, верагодна, ён адбыўся ад назвы мужчынскай малітоўнай кашулі «кіттель» (ад нямецкага «kitel» – блуза).

Аб вопратцы габрэйскіх жанчын губерні існуюць наступныя пасведчанні: «Женщины-еврейки разумеется, достаточные, одеваются в кунтуши, юбки и корсеты разноцветные: люстриновые, атласные, гранитуровые и ситцовые. Нагрудники дорогой битой парчи <...> галуном обшитые». Да збору музея належыць і «нажутка-безрукаўка з слуцкай тканіны XVIII стагоддзя» [6] (КП 945).



Камізэлька. Кан. XVIII – пач. XIX ст. Парча. Палатно

«Наржутка» у перакладзе з польскай мовы адзначае накідку – «адзенне (pelerynka, narzutka)». Крой камізэлек габрэек (адкладны каўнер, двухбортная засцежка, вытачкі, валікі) характэрны для заможных мяшчанак па-за залежнасці ад нацыянальнасці і веравызнання.

Вядома, што да калекцыі раней ставілася кофта з нагруднікам («брысціхлам»). Прадмет у выглядзе паласы парчы або шоўка прыкрываў засцежку, завязваўся на шыі і поясе. Нагруднік («naperśnik»), які называўся «zalóżką» ад жэсту залажэння за яго рукі злева, сімвалізаваў сціпласць нявесты. [15, стар. 138]. На акварелі Ю. Пешкі з выявай Віцебска – гараджанка, ў касцюме якой прысутнічае гэты прадмет.

Спадніцы комплексу мяшчанскага касцюма у складку, доўгія, са устаўкамі наперадзе з лёну або бавоўны, былі пашыты з шоўку, атласу – мануфактурных тканін, ўпрыгожаных суквеццямі, матылямі, дрэўцамі і квітнеючымі травамі (КП 1236/а, 1237/а)



Юбка. Кан. XVIII - пач. XIX ст. Атлас. Бавоўна.

Багатыя тканіны адносяцца да стылістыцы «шынуазры» («chinoiseries») (от фр. «chinois» – кітайскі), якая была пашырана ў Еўропе ў XVIII стагоддзі (выкарыстанне матываў і прыёмаў сярэднявечнага кітайскага мастацтва).

Вастраверхія каруны мяшчанак блізкі па форме да славянскага дзявочага ўбору (вянца). Яны, як і камізэлькі, выкананы з парчы кветкавага дэкору, тыповага для эпохі барока, або з шаўковага рэпса, аздобленага пазументам, бліскаўкамі, біццю і каніцеллю, з аксаміту (КП 1180–1182, 1198).



Каруна. Кан. XVIII. Парча. Карункі. Нітка ільняная. Нітка металічная. Пляценне. Палатно

Падобныя галаўныя уборы насілі ў Лепелі, Чашніках, Уле. В. Завялейскі апісвае ўборы віцебскіх мяшчанак: «замужние надевают на головы «шапечки», похожие на старые гренадерские шапки. Шапочки бывают из черного бархата, иногда золотой парчи, и тогда называются златоглавыми» [11, стар. 656]. У калекцыі ёсць вянец з глазета з шкляными пацеркамі штучнага жэмчуга (КП 1179).

Да збору музея належаць габрэйскія галаўныя ўборы XVIII – XIX стагоддзяў, пашытыя з кліноў. Згодна вопісу пачатку XX стагоддзя, гэта зялёная плюшавая шапачка з вышыўкай, кісцю і шапачка з парчы з бліскаўкамі [5]. Край першай не апрацаваны, магчыма, гэта жаночы галаўны убор і раней да яго быў падшыты парык. У РЭМе знаходзяцца падобныя шапачкі з парыкамі з саціну – «гаубы» (пасля вяселля габрэйскай жанчыне коратка стрыглі валасы, апраналі парык і галаўны ўбор) (КП 1191). Другі галаўны ўбор з кліноў – мужчынскі, гэта кіпа (КП 1195); ў архіве значыцца кіпа («мужчынская ярмолка з слуцкай парчы») [6] (КП 1192). Гэтыя прадметы мужчынскага адзення, верагодна, насілі ў свята Ём-Кіпур. Тады надзявалі «кіттель», пояс і талес. У калекцыі знаходзяцца фрагменты малітоўнай накідкі «талеса» (КП 1377/1–3), у ліку прадметаў апісаны «аграмант ад талеса срэбны».

На акварэлі Ю. Пешкі ў Віцебску каля Васкрасенскай царквы, акрамя мяшчанак у высокіх галаўных уборах, абгорнутых наметкамі, сарочках, спадніцах і фартухах – жанчыны, апранутыя ў саяны і расшытыя золатам шапачкі. Да калекцыі належаць рускія народныя галаўныя ўборы XVIII – XIX стагоддзяў. Канструкцыя аднаго з іх, «сарокі» наступная: зверху – галун, па баках – шоўкавыя стужкі «крылаткі»; аксамітны назатылень і пазатылень з лёну, аздобленыя залачоным шыццём (пазалочанае срэбра) [5] (КП 1183). Н. Анімеле паведамляе, што у адзенні жыхароў Веліжскага, Невельскага, Себежскага паветаў прыкметна перавага рускага элемента, у Дрысенскім павеце «сароку» называлі перавязь і апраналі да вяселля [1, стар. 113]. У фондах захаваліся какошнікі ў выглядзе шапачак, касынка з парчы [4] (КП 1184–1186, 1260).

Для шыцця святочнага адзення выкарыстоўвалі мануфактурныя тканіны і аздабленні. У музеі захоўваецца калекцыя тканін XVIII – XIX стагоддзяў. Асноўная частка фондаў ўключае расійскія тканіны [7]. Вядома, што малюнкі тканін XVIII стагоддзя былі пераважна замежнымі – рускія майстры капіравалі арнаменты, у першую чаргу з двух шаўковых цэнтраў – французскага Ліёна і нямецкага Крэфельда, а таксама – з Кітая. Сучаснікі паказвалі на высокую якасць рускіх тканін [9, стар. 11–35]. Да калекцыі належаць фрагменты слуцкіх паясоў, паясоў слуцкага тыпу другой паловы XVIII стагоддзя. Калі ў пачатку XIX стагоддзя вытворчасць аксесуараў спыняецца, з іх часам шыюць вопратку: прыкладам з'яўляюцца фрагменты ў выглядзе крою адзення, невялікая сумка з фрагментаў пояса Ліёнскай мануфактуры і габрэйская камізэлька з сярэдніка слуцкага пояса (КП 1272, 1165, 945).

Мяшчанкі Віцебскай губерні насілі ўпрыгожванні: каралі – «гырнаты» (гранат), «бруштын», «пярловые мацицы» (жэмчуг); медныя, сярэбраныя, са шкляруса «завушницы»; бронзавыя і алавяныя «пярсцёнки» [16, стар. 131]. У фондах захаваліся завушніцы ў выглядзе кошыка з

кветкамі, падвескай «сліва», асновай якіх з'яўляецца метал, абцягнуты сеткай з дробнага жэмчугу; пацеркі з бурштыну, каралаў XVIII – пачатку XIX стагоддзяў [6] (КП 1661, 3471, 3473).

Дапаўненні да касцюму былі выкананы пры дапамозе розных тэхнік. У фондах знаходзіцца калекцыя жаночага рукадзелля канца XVIII – XIX стагоддзяў, прадметы вышыты габеленавым швом, бісерам, звязаны кручком [16, стар. 131]. Першыя схемы вышываных малюнкаў надрукаваны ў 1810 годзе ў Германіі [2] (КП 1171).



Узорнік для вышывання. Германія. Берлін. Першая палова XIX.ст. Папера. Каляровы друк

Раней матывы з выявамі жывёл, птушак, дрэў, кветак, арнаменту, карон, манаграм, літар алфавіту вышываліся на фрагментах лёну. Асновай малюнкаў былі італьянскія, французскія зборнікі ўзораў XVI – XVII стагоддзяў Дж.-А. Вавасоры, Н. Зопіно [12, стар. 31, 33, 34]. Арнаменталісты XVI стагоддзя адрадзілі старажытны матыў – гратэск, які складаўся з спляцення раслінных і жывёльных формаў, ён стаў адным з асноўных элементаў еўрапейскай арнаментыкі.

Вядома, што у Расіі ў XIX стагоддзі часопісы «Вестник Моды», «Модный курьер» таксама друкавалі схемы для вышыўкі. Да канца стагоддзя захаваліся прыёмы ўпрыгожвання прадметаў, але павялічыўся памер бісеру, замест габеленавага шва ўжывалася вышыўка крыжыкам шэрсцю. Ўзоры прадметаў, а таксама матывы капіраваліся, пераапрацоўваліся і выкарыстоўваліся ў адзенні мяшчан. Сярод прадметаў сумачкі, капшукі, паясы з гірляндамі руж, фіялак, вінаграднай лазы, лісця аканта (КП 1152/2, 1157, 1386, 1173–1176). Паясы падобнага тыпу знаходзяцца ў музеях Латвіі [13].

Танныя друкаваныя «бракараўскія узорнікі» з падобнымі арнаментамі атрымалі распаўсюджанне у народным тэкстылі канца XIX – пачатку XX стагоддзяў. Прыклад таму вышываная крыжыкам галінка дуба на какетцы жаночай даматканай сарочцы (КП 1235/2). Стылізацыя арнаменту нагадвае матыў на ўзоры XVI стагоддзя з Італіі (калекцыя Эрмітажу). [12, стар. 118]. Адзін з узорнікаў зборніка 1530 года Н. Запіна прадстаўляе архаічны матыў у выглядзе васьмівугольнай зоркі [12, стар. 13]. Ён вытканы на падоле дзявочай спадніцы (КП 1230/2). Яе крой практычна супадае з апісаннямі Н.Я. Нікіфароўскага [16, стар. 116].

У калекцыі захаваўся фрагмент жаночай сарочкі, упрыгожанай на плячах устаўкай з «цветной домотканки» чырвонага колеру з рукавамі старажытнага пакрою без манжэтаў – скошанага, звужанага кнізу без збор, але з клінамі, з вышыўкай адзіночных элементаў крыжыкам (КП 1233/2) [14]. У фондах ёсць і калекцыя ўставак з тканым архаічным арнаментам з ромбаў, грабеністых фігур, свастычных выяў (КП 1369/4). Жаночы фартух пашыты з ільняных, кумачовых уставак, фрагментаў полікаў, затканых чырвонымі, сінімі ніткамі. (КП 1237/2). Канструкцыя артэфактаў дазваляе аднесці іх да адзення рускага насельніцтва губерні.

Да калекцыі належаць полікі з выявай васьмівугольнай зоркі, вышываныя крыжыкам; выкананыя у тэхніце «роспіс», якая вядома ў еўрапейскай гарадской культуры XV–XVI стагоддзяў. Навалачкі, абрусы, пакрывалы таго часу, упрыгожаныя швом «гальбейн» (роспіс), італьянскім падвойным крыжам захоўваюцца ў Эрмітажы [12, стар. 10,11, 60, 88, 118]. Вядома, што двухбаковае шытво роспіс ўжывалася ў паўночных губернiях Расіі, было характэрна і для традыцыйных вышываных тканін беларуска-рускага паграніччa XIX стагоддзя. Яшчэ два артефакта з музея – жаночыя чапцы, упрыгожаныя вышыўкай шэрсцю сімваламі ў выглядзе крыжа, перасечаных квадратаў, васьмівугольнай зоркі, характэрнымі для абрадавых мужчынскіх і жаночых кашуль сібірскіх стараввераў-«палякаў» Алтая другой паловы XIX стагоддзя з музея ИАЭТ СА РАН (КП 1371/1,2) [17].

У ліку рарытэтаў мужчынскія сарочкі старажытнага тунікападобнага крою з пасконі з

прамым разрэзам на грудзях, ільняная сарочка-касаваротка (КП 1231/2, 1232/2).



Сарочка-касаваротка. XIX ст. Палатно

Сарочкі-касавароткі з разрэзам каўнера па левым баку з'явіліся ў рускага народа у XIV–XV стагоддзі, выцесніўшы крой тунікаабразных кашуль усходніх славян з прамым разрэзам каўнера [3]. Артэфакты з музея, насовы двух тыпаў, маюць характарыстыкі, якія практычна супадаюць з апісаннямі Н.Нікіфароўскага. [16, стр. 109, 110]. Адзін з насоваў з бавоўны кафтаннага крою, упрыгожаны фабрычнай тасьмой.



Насоў. Канец XIX–пач. XX ст. Бавоўна

Другі – ільняны халатападобнага крою, які меў яшчэ назву «балахон» (КП 1247, 4177) [10]. Месца бытавання прадметаў: паветы, якія мяжуюць са Смаленскай і Пскоўскай губернямі. У калекцыі музея – паясы, выкананыя ў розных тэкстыльных тэхніках з матывамі у выглядзе палосак, ромбаў, трохкутнікаў; крыжыкаў, грабенчыкаў, вугалкоў і зігзагаў (КП 1200–1227); палатняны капшук, пашыты з раней вытканага узорнага палатна.

Каб ўпрыгожыць адзенне, сяляне, пры дапамозе набіўных дошак, наносілі на тканіну друкаваныя малюнкі. Класічнай для губерні была набіванка, выкананая фарбай індыга (белы арнамент на сінім фоне). Прыклад афарбаванай тканіны – устаўка да атласнай мяшчанскай спадніцы (КП 1236/1). У калекцыі захаваўся ільняны фрагмент шматколернай масленай набойкі XVIII стагоддзя (мал. 9) (КП 1375) [18, стр. 22]. Узор на дошках з калекцыі ў выглядзе веерных кветак, грацыёзных матылькоў, персідскага кіпарысавага ліста нагадвае стылістыку арнаментаў ўсходніх шаўковых тканін (КП 206/7,9,24).

Спіс скарыстаных крыніц


1. Анимеле, Н. Быт белорусских крестьян / Н. Анимеле // Этнографический сборник, издаваемый императорским русским географическим обществом. Выпуск II. С.-Петербург. Типография Министерства внутренних дел. 1854. – С. 113.
2. Будур, Н. Полная энциклопедия женских рукоделий: в 2–х т. /Н. Будур. – Москва: Олма-Пресс, 1999. –Т. 1 – 590 с.; Т.2. – 584 с.
3. Висковатов А. В. Историческое описание одежды и вооружения российских войск с рисунками, составленное по высочайшему повелению. Спб., 1899, ч. 1, с. 13; Zelenin D. Op. cit., S. 199—200.
4. ВОКМ. Научный архив.– Ф. 8. – д. 2. Инвентарная опись музея высшего

педагогического института. Книга 2. Одежда городская.
5. ВОКМ. Научный архив. – Ф. 10. – д. 3. Инвентарная опись бывшего музея В.П. Федоровича. Одежда, обувь, ткани и украшения.
6. ВОКМ. Научный архив. – Ф. 12. – д. 8. Спіс прадметаў яўрэйскай культуры.
7. ВОКМ. Научный архив.– Ф. 5. – д. 2. Годовой отчет Витебского губернского музея за 1920 г.
8. Гессен, Ю. Одежда / Ю. Гессен // Еврейская энциклопедия под общей редакцией д-ра А. Гаркави и д-ра Л. Кацнельсона. – СПб: Издание общества для научных еврейских изданий и издательства Брокгауз-Ефрон. – Т.12. Обычай – проказа. – С. 960.
9. Демиденко, Ю. Прочнее стали, тоньше паутины... / Ю. Демиденко // Теория моды: одежда, тело, культура. – 2012. – №25. – с. 11–35.
10. Заварина А.А. Русское население восточной Латвии во второй половине XIX – начале XX века. Историко-этнографический очерк / А.А. Заварина. Рига:, Зинатне, 1986. – 248 с.
11. Завелейский, В. Витебск / В. Завелейский // Северная пчела. – 1834. – 23, 24 июля – № 164, 165. – С. 656.
12. Косоурова Т.Н. Искусство вышивальщика: Западноевропейская вышивка XVI – начала XX века в Эрмитаже: каталог выставки /Т.Н. Косоурова; Гос. Эрмитаж. – СПб.: Славия, 2004 – 279 с.
13. Latviešu tautastērpi. 3. sēj.: Zemgale, Augšeme, Latgale / Sast. Z. Bremze, V. Rosenberga, I. Ziņģīte; teksta aut. V. Bandere, I. Ziņģīte – Rīga: Latvijas Vēstures muzejs, 2003. – 366 c.
14. Маслова Г. С. Народная одежда, с. 613.
15. Mozozynska-Nawotka, Malgorzata. O modax i strojach. – Wroclaw: Wydawnictwo Dolnoślaskie Sp-zoo, 2002. – 268 c.
16. Никифоровский, Н.Я. Очерки простонародного житья-бытья в Витебской Белоруссии и описание предметов обиходности: Этнографические данные. – Витебск, 1895.
17. Фурсова Е.Ф. Сибирские старообрядцы: история в костюмах / Е.Ф. Фурсова // Наука из первых рук. – 2009. – № 3– С. 84– 91.
18. Якунина, Л. И. Русские набивные ткани XVI – XVII вв. / Л. И. Якунина; ред. Б. А. Рыбаков. Гос. истор. музей – Москва: Государственный исторический музей, 1954. – С. 21.

УДК 687

# ОПРЕДЕЛЕНИЕ ТИРАЖА МОДЕЛЕЙ ЖЕНСКОЙ ОДЕЖДЫ

***Федотова И.В.[1] к.т.н., доц.,***
***Диева О.Н.[2] к.т.н., член союза дизайнеров России***

*[1] МГУТУ им. К.Г. Разумовского (ПКУ) г. Москва, Российская Федерация*
*[2] ЮЗГУ г. Курск, Российская Федерация*

Реферат. *Одной из основных задач при проектировании одежды является определение такого выпуска (тиража) модели, при котором модель была бы реализована полностью, что обусловлено множеством разнообразных факторов, образующих систему предпочтений, мотивов, которыми руководствуется потребитель при покупке. Однако во всех случаях тираж должен соответствовать представлению покупателя о допускаемой вероятности частоты встречаемости (ДВЧВМ) одежды в обществе.*

Ключевые слова: тираж, величина тиража, потребление моды, статистика, частота встречаемости модели, предпочтения потребителя.

ДВЧВМ покупателей, как показали исследования, зависит от его биосоциальных признаков, стереотипов, преследуемых целей и установок. Например, одной из целей может быть стремление подчеркнуть дистанцию и свою значимость, быть заметным, или, наоборот, сделать попытку сблизиться с людьми, не быть одетым как кто-либо из окружающих. В других случаях в силу вступает установка о покупке модной одежды независимо от остальных или из стремления не быть одетым как кто-либо из окружающих. На принятие таких полярных решений оказывают влияние биосоциальные признаки (возраст, телосложение, образование, социальное положение, место жительства, психологический тип личности, цветовой тон, семейное и материальное положение),